# ВЫХОЎВАЦЬ

СЛОВА «НАСТАЎНІК» МАЕ ДВАЯКІ СЭНС: У ВУЗКІМ РАЗУМЕННІ — ГЭТА ВЫКЛАДЧЫК ТАГО ЦІ ІНШАГА ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА; У ШЫРОКІМ СЭНСЕ ГЭТАГА СЛОВА — АЎТАРЫТЭТНЫ, МУДРЫ ЧАЛАВЕК, ЯКІ АКАЗВАЕ ВЯЛІКІ ЎПЛЫЎ НА ЛЮДЗЕЙ.

**М. І. КАЛІНІН.**



*НА ЗДЫМКУ: першы урок. З яго пачынае свой шлях кожны настаўнік. Вядома, хвалюецца і студэнтка філфака Зоя Хрышчановіч. А дзеці? Яны вельмі прыхільна сустрэлі маладую настаўніцу.*

*Добрыя веды, атрыманыя ва універсітэце, імкненне авалодаць педагагічным майстэрствам і карысныя парады старэйшых таварышаў — настаўніцы Г. К. Раковіч і метадыста У. К. Андрэенкі — дапамаглі практыкантцы з поспехам правесці першыя заняткі.*

*На другім здымку вы бачыце групу практыкантаў з метадыстам У. К. Андрэенкам у час разбору урока. Ацэнка першага урока З. Хрышчановіч — выдатна.*

*Фота П. Нікіціна.*



## ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ!

Вось ужо тры гады студэнты дзённага і вячэрняга аддзяленняў філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна трапляюць да мяне як настаўніка і метадыста і праходзяць педагагічную нрактыку па беларускай мове і літаратуры. І кожны раз, развітваючыся са сваімі яшчэ не дужа вопытнымі маладымі сябрамі і будучымі калегамі, мяне агортвае шчымлівае пачуццё. У адным выпадку таму, што шкадую: магчыма, болей ніколі не давядзецца сустрэцца з цудоўнымі маладымі людзьмі, такімі сардэчнымі і працавітымі, нястомнымі ў пошуках і энергічнымі; у другім таму, што непакоюся: а як складуцца асабісты лёс і працоўная дзейнасць таго, хто вось-вось атрымае пуцёўку ў жыццё (або нават атрымаў яе), але пакуль што, хоць і правучыўся пяць ці шэсць гадоў ва універсітэце, не адчувае прызвання да такой цяжкай, але цікавай і па-сапраўднаму творчай прафесіі, як прафесія настаўніка. І ў выніку бывае так: скончылі філалагічны факультэт, а на працу уладкаваліся куды хочаце— у кніжную палату, выдавецтва, нават у рэстаран, — але толькі не ў школу. Чаму? Спалохаліся цяжкасцей. Адчуваюць — нялёгкая справа. Тут не спынішся на тым, што атрымаў у сценах універсітэта. Тут сапраўдныя пошукі, нястомныя, штодзённыя, толькі пачынаюцца. І не відаць хоць часовага адпачынку ад бесперапынных клопатаў.

Але затое колькі асалоды, нават пры ўсіх няўдачах, непажаданых і нечаканых ускладненнях, калі дасягнуў няхай сабе маленькага поспеху, калі адчуў упэўненасць — змагу... пераадолею.

Студэнтка пятага курса філалагічнага факультэта Людміла Шавель ужо сёння можа ісці ў школу. Яна па-сапраўднаму апрабавала свае сілы. І, скажу ад сябе, безумоўна, будзе мець поспех. Люда выдатна валодае класам. Патрабавальная да сябе і да вучняў і адначасова — чулая і ўважлівая.

Галіна Германьева — поўная супрацьлегласць ёй па тэмпераменту. Мяккая, нават крыху запаволеная, яна аднак умее ўздзейнічаць нават на самых непаслухмяных і таксама карыстаецца заслужанай павагай. Практыканткі Іна Марціновіч, Надзя Кніга, Оля Хадасевіч — кожная па-свойму, адна з большым, другая з меншым поспехам, умеюць падпарадкаваць сабе вучнёўскі калектыў і валодаюць неабходным запасам метадычных ведаў.

Не магу не ўспомніць шчырым словам студэнтаў-практыкантаў вячэрняга аддзялення, якія зараз на шостым курсе: Г. Павільч, С. Грытчанка, О. Маршак, М. Кушаль, Я. Раманенку. У мінулым, 1968—69 навучальным годзе, яны праходзілі педагагічную практыку ў 31-й школе рабочай моладзі. Ім, вячэрнікам, даводзіцца куды цяжэй: трэба штодзённа і працаваць, і вучыцца. Але такі дружны, арганізаваны і дысцыплінаваны калектыў можна паставіць у прыклад любому іншаму. У гэтых маіх маладых калег было ўсё: і пунктуальнасць, і працавітасць, і пераймальнасць у добрым сэнсе гэтага слова. І таму сапраўднай павагай карыстаюцца яны і ў вучняў, і ў настаўніцкім асяроддзі.

Усім, з кім мне даводзілася мець справу, я шчыра жадаю: шчаслівай дарогі! Творчых поспехаў! Асабістага шчасця!

**В. МАШКО,**
**настаўнік 31-й ШРМ г. Мінска.**

# ЧАЛАВЕК

*У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ*

-ратары павінны былі так рэгламентаваць прыём наведвальнікаў, каб ніхто не чакаў Уладзіміра Ільіча больш 5 мінут. Вось, напрыклад, што расказваў В. А. Смальянінаў аб сваёй першай сустрэчы з У. І. Леніным пасля таго, як ён быў назначаны памочнікам упраўляючага справамі Саўнаркома.

З гасцініцы «Нацыяналь», дзе ён у той час спыніўся, Смальянінаў пазваніў у прыёмную старшыні Саўнаркома і спытаў у сакратара, калі яго можа прыняць Уладзімір Ільіч. Л. А. Фоціева адказала, што для размовы з ім У. І. Ленін вызваліцца прыкладна праз гадзіну і папрасіла Смальянінава чакаць яе званка. Праз гадзіну яна пазваніла і паведаміла, што Уладзімір Ільіч крыху затрымліваецца і просіць прабачэння. А яшчэ праз 15 мінут ён быў ужо запрошаны ў Крэмль.

Калі В. А. Смальянінаў прыйшоў у прыёмную У. І. Леніна, там, як ён успамінае, нікога не было і яму амаль не прыйшлося чакаць. Ён толькі паспеў прадставіцца, як ад Уладзіміра Ільіча выйшаў наведвальнік і заходзіць прапанавалі ўжо яму. Смальянінаў піша, што «я прабыў у Леніна каля дзвюх гадзін і калі выходзіў, у прыёмнай па-ранейшаму не было наведвальнікаў».[12] Значыць, на той час, калі Ільіч прымаў Смальянінава, да яго ніхто больш не запрашаўся і, такім чынам, ніхто дарэмна не траціў часу ў прыёмнай.

І яшчэ адзін прыклад, які паказвае, як рашуча выступаў У. І. Ленін супраць беспрыснай траты часу. Л. А. Фоціева расказвае, што ў пачатку работы Савецкага ўрада многія кіраўнікі устаноў і ведамстваў, якія выклікаліся на пасяджэнне Саўнаркома з дакладамі па таму ці іншаму пытанню, прыводзілі з сабой мноства дакладчыкаў «на ўсякі выпадак»: а раптам спатрэбіцца якая-небудзь даведка, якую, скажам, нарком або яго намеснік не змогуць даць. Гэтыя дакладчыкі звычайна чакалі ў адным з пакояў, дзе яны гулялі ў шахматы, чыталі газеты, курылі і г. д. Калі Уладзімір Ільіч аднойчы, праходзячы выпадкова праз гэты пакой, убачыў там стомленых і змучаных таварышаў, якія займаліся хто-чым у клубах папяроснага дыму, то ён абурыўся на сакратароў за такі парадак і тут жа распарадзіўся так арганізаваць справу, каб пытанні з дакладчыкамі ставіліся на абмеркаванне ў пачатку пасяджэння і самі дакладчыкі прыходзілі толькі за 15 мінут да заслухоўвання пытання. А 13 кастрычніка 1921 г. У. І. Ленін, як вядома, напісаў наступную запіску ўпраўляючаму справамі Саўнаркома і СПА:

«Тав. Гарбуноў!

Прашу Вас правесці, пасля адпаведнай згоды са старшынёй Малога СНК (і высвятлення з сакратарамі). каб парадак выкліку дакладчыкаў (і ў Вялікі і ў Малы СНК) быў зменены.

Цяпер дакладчыкі атрымліваюць выклік на пасяджэнне ўвогуле і чакаюць гадзінамі.

Гэта абуральна і дзіка.

Трэба дабіцца таго, каб дакладчыкі выклікаліся на **адзін пэўны час.**

Пры двайной праверцы па тэлефону, ці патрэбны дакладчыкі, і якія; пры **правільным** размяшчэнні спраў пэўнага пасяджэння (справы з дакладчыкамі і справы без дакладчыкаў) можна і неабходна дабіцца таго, каб **больш 15 мінут** дакладчыкі **не чакалі.**

Прашу Вас выпрацаваць такі парадак неадкладна, старанна прадумаць яго, і паведаміць мне рашэнне аб гэтым, праведзенае праз Малы Савет Народных Камісараў»[13].

Змест гэтай запіскі паказвае, як рэзка асуджаў У. І. Ленін бюракратычныя метады работы і як ён клапаціўся аб тым, каб пасяджэнні розных органаў менш займалі ў людзей часу.

Немагчыма ў адной лекцыі расказаць аб усім, што было уласціва У. І. Леніну як чалавеку, паказаць прыёмы і метады яго паўсядзённай працы. Але нават тыя з іх, аб якіх гаварылася вышэй, паказваюць, што Уладзімір Ільіч быў выключна гарманічным чалавекам, у якім камуністычная ідэйнасць была неаддзельна ад усяго яго жыцця і практычнай дзейнасці.

В. А. Карпінскі пісаў: «І калі я ўспамінаю усё, што магу ўспомніць аб ім, заўсёды думаю і адчуваю, што Уладзімір Ільіч быў камуністам не толькі па ідэях сваіх, па сваёй грамадскай дзейнасці, але і ў асабістым жыцці, у быту, быў правобразам тых дасканалых людзей, якія будуць жыць у камуністычным грамадстве»[14].

Савецкія людзі будуюць камунізм. Зразумела, што імкненне працаваць і жыць па Ільічу павінна стаць важнейшым правілам для ўсіх будаўнікоў гэтага грамадства.

**Г. ГЕРАСІМЕНКА,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

[1] Л. А. Фотиева. «Из жизни Ленина», стр. 46.
[2] Там же, стр. 46—47.
[3] Там же, стр. 47.
[4] «Штрихи великого портрета. Воспоминания о В. И. Ленине», стр. 13; Л. А. Фотиева «Из жизни Ленина», стр. 47—48.
[5] «Воспоминания о В. И. Ленине», ч. 2, стр. 295.
[6] Там же, стр. 218—219.
[7] Н. К. Крупская «Воспоминания о В. И. Ленине», стр. 485.
[8] Л. А. Фотиева «Из жизни Ленина», стр. 56.
[9] «Воспоминания о В. И. Ленине», ч. 2, стр. 32—33.
[10] Там же, стр. 701.
[11] Там же, стр. 219.
[12] «Штрихи великого портрета. Воспоминания о В. И. Ленине», стр. 44—45.
[13] В. И. Ленин. Полн. собр. соч., т. 53, стр. 262
[14] «Воспоминания о В. И. Ленине», ч. 2, стр. 704.

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 37 (1969 г.), 1, 2, 3 (1970 г).*

